# ВЯЗЕНЬ МАЎТХАЎЗЕНА № 32936

## З успамінаў Расціслава Васільевіча Дуброўскага, жыхара г.п. Вялікая Бераставіца

Акупацыя Польшчы Германіяй у 1939 г. закружыла ў ваеннай віхуры і мяне, шаснаццацігадовага юнака з Ваўкавышчыны. Быў некаторы час у Лодзі, потым лёс закінуў у Чэхаславакію, вярнуўся зноў у Лодзь. Папаў у аблаву, загналі ў таварняк і павезлі ў Германію. Уцёк. Спрабаваў перайсці мяжу з Усходняй Прусіяй, каб там стаць непрыметным сярод остарбайтэраў (усходніх рабочых), але зноў папаўся. Гэта быў канец жніўня 1942 г.

... І вось за ўсё гэта - Маўтхаўзен... Сюды сагналі тысячы людзей з усіх канцоў Еўропы. Я ўжо не меў ні імя, ні прозвішча, ні нацыянальнасці, а быў вязень - «хефтлінг» № 32936, які штодзённа цягаў ваганеткі з глыбамі граніту ў каменяломнях.

... Памятаецца і такое. У скале 186 ступеняў. Крутых, высокіх. Па іх вязні неслі кавалкі граніту з глыбокага катлавана наверх, да ваганетак. Гэта страшна цяжкая, смяротэльна небяспечная работа. Людзі ідуць гуськом, згібаючыся ў нечалавечым напружанні. На плячы або ў руках у кожнага вялізны камень. Трымаюць іх дрыжачымі рукамі, ногі таксама дрыжаць ад вялікага напружання. А лесвіцы няма канца, ідуць вобмацкам, асцярожна нашчупваючы кожную прыступку. Дзесьці збоку і зверху крыкі эсэсаўцаў: «Шнэль! Шнэль!». Рукі ледзь трымаюць камень. А трэба абавязкова ўтрымаць. Не дай Бог, камень сарвецца. Гэта смерць для многіх людзей.



*Р. В. Дуброўскі.*

... А ступеням быццам і няма канца. Камень з кожнай прыступкай становіцца ўсё цяжэйшым. Але калі хочаш жыць - трэба ісці... І ў гэтыя хвіліны адчаю, як гаючы бальзам, як быццам голас з неба, прагучаць раптам словы: «Трымайся, браток, трымайся».

Многія не вытрымлівалі: кідаліся на калючы дрот пад высокім электрычным напружаннем ці проста пад аўтаматную чаргу. Пасля кожнай ночы выносілі з баракаў дзесяткі трупаў і складвалі штабялямі на пляцы. У печах крэматорыя не паспявалі спальваць ахвяры. Гналі туды і жывых. Праўда, гэта былі не людзі, а іх жывыя цені, шкілеты.

Распарадак дня ў Маўтхаўзене быў такі: пад’ём у 6 гадзін.

Раніцай і вечарам - чарпак эрзацкавы, у палудзень - паўлітра баланды з бручкі і на цэлы дзень 250 грамаў хлеба, адна назва, што хлеб. Працавалі па 10-12 гадзін.

Зняволеных касілі хваробы: туберкулёз, дызентэрыя, вадзянка. Пры такой кармёжцы, якая была ў канцлагеры, чалавек апухаў да непазнавальнасці і ўжо выкараскацца з абдымкаў смерці не мог. Далей ён пападаў у санітарны барак, а потым у печ крэматорыя. Яна дыміла і дыміла, як напамінак аб канчатковым выніку нашага пакутніцкага існавання ў блоках Маўтхаўзена...

Але ўсё-такі і тут, у санітарным бараку, іскрынка надзеі цеплілася ў сэрцах рабоў фашысцкага рэйха. Людзі згуртоўваліся ў зямляцтвы, як маглі падтрымлівалі адзін аднаго. Падбадзёрваючае слова ці нават погляд, рука ці плячо таварыша, падстаўленыя ў час, калі ты пахіснуўся ці пакаўзнуўся, дапамога хвораму кавалачкам хлеба, няхай і вельмі маленькім, але ад усяго сэрца аддадзеным, усё гэта давала веру ў чалавечае дабро, таварыскасць, людскасць.


Absender: Wasil Dubrowski
An
Rostislaw Dubrowski
geb. 26-3-23 Nr. 32936 Blok A K.P.
K.L. Mauthausen
Oberdonau

***Асабістая ўліковая картка вязня канц-лагера Маўтхаўзен Р.В. Дуброўскага.***

Не справіўся і я з хваробамі, якія апанавалі мяне. Папаў у славуты санітарны барак. Санітарным ён быў толькі па назве, а на самай справе мы яго называлі апошнім кругам «пекла». Гэта быў пераразмерка-вальнік лагернікаў на тых, хто яшчэ мог працаваць і на «дахадзях», якім адна дарога - у печ крэматорыя. У лагеры людзі гінулі ад холаду і голаду, ад хвароб і пабояў. А ў «лазарэце» над знясіленымі, хворымі людзьмі яшчэ і ставіліся розныя медыцынскія вопыты.

Санітарны барак часта абходзілі эсэсаўцы, пальцам паказваючы на безнадзейна хворых. І на каго ўпіраўся гэты палец, тыя ўжо разумелі, што гэта - канец... Адабраных такім чынам хворых валаклі ў душагубку і везлі да крэматорыя. І кожны разумеў, што калі не сёння, то заўтра ён можа апынуцца сярод тых, на каго пакажа палец эсэсаўца.

Але так, мусіць, было наканавана мне лёсам, што ні заўтра, ні паслязаўтра самае страшнае для мяне не наступіла. Мяне змаглі выратаваць чужыя, незнаёмыя мне людзі, як кажуць, літаральна вырвалі з кіпцюроў смерці. Не ўсіх «пацыентаў» санітарнага барака, але

некаторых усё ж ім удавалася ратаваць. Там працавалі ўрачамі і санітарамі тыя ж самыя зняволеныя медыкі з усіх канцоў свету: і чэхі, і палякі, і французы, і рускія... Яны стараліся дапамагчы хворым, знямоглым людзям, у якіх яшчэ цеплілася надзея на жыццё. І, вядома, не лякарствамі, якіх там не было, а добрым словам, спачувальным поглядам, карыснай парадай.

Сярод лагерных медыкаў быў і вязень №37302, студэнт-медык з Украіны Міхаіл Бурлачэнка. Перад тым, як немцы прыходзілі на «выбракоўку», то цягаў ён і іншыя таварышы і мяне, і іншых больш-менш мацнейшых «хефтлінгаў» у другі канец санітарнага барака, што лічыўся аддзяленнем для тых, хто папраўляўся. І так не адзін раз. Як потым мне расказваў сам Міхаіл Бурлачэнка, такім жа чынам выратавалі і яго. Дарэчы, ён жыве і працуе ў Сяміпалацінску, прафесар, доктар медыцынскіх навук. Мне ўдалося яго адшукаць, і мы некалькі разоў ужо сустракаліся, успаміналі страшнае мінулае.

3 верасня 1942 г. да 6 мая 1945 г. - дня вызвалення - цягнулася мая пакутніцкая адысея. Не ведаў я тады, што дома на доўгачаканай Радзіме мяне і многіх іншых, такіх як я, чакалі таксама... сталінскія лагеры.

Запісаў Мікалай Пацэнка, г.п. Вялікая Бераставіца,
1998 год.